http://edoc.bseu.by:8080

логий, а речь идет о создании отдела, который не только продает достижения своих лабораторий, но и заключает договора с малыми и средними предприятиями о предоставлении им различных технологических разработок.

ж) Привлечение студентов с высоким уровнем знаний для дальнейшего обучения в аспирантуре, получения докторских степеней также является целью университета, а также установление отношений между университетом и территориальной производственной системой для того, чтобы предприятия смогли привлекать лучших выпускников.

**Улучшение организации территории.**

а) Отношение с административными органами и агентствами различных услуг.

Речь идет об установлении постоянных связей сотрудничества с различными административными органами, а также о количественном и качественном улучшении вознаграждений, платы и координировании действиями, направленными на улучшение региональной производственной системы и эффективности всех поддерживаемого пространства. б) Связи с региональной производственной системой. Основная идея заключается в попытке увязать внешнюю региональную производственную систему с внутренней. в) Связи со всей образовательной системой.

Речь идет о составлении графика “netuork”. Сложно представить, что институт, на который приходится как минимум 30% предложения всей образовательной системы не имеет с ней установленных связей.

Кроме того, университет может способствовать развитию своих отношений с иностранными коллегами, что является традиционной функцией университета и которая может быть расширена за счет создания формальных и неформальных связей стимулируемых ректоратом университета, с производственной системой. Сам ректорат университета может активно участвовать в международных ассоциациях университетов.

Заключение.

Университет имеет перед собой много поставленных задач и функций и должен иметь гибкие организационные структуры и формы управления способные легко адаптироваться к новой, изменяющейся ситуации.

*Г.П. Бушчык*
Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт

## АБ ВЫВУЧЭННІ ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНЫХ СУВЯЗЯЎ БЕЛАРУСІ

Выхад Беларусі на сусветны рынак як незалежнай дзяржавы, працэсы глабалізацыі эканомікі ставяць новыя задачы ў падрыхтоўцы спецыялістаў па знешнеэканамічнай дзейнасці. Ім важна засвоіць не толькі міжнародны вопыт, але і дакладна ўяўляць эканамічны патэнцыял Беларусі, яе традыцыйныя і новыя накірункі гаспадарчай дзейнасці, рэальныя і патэнцыяльныя магчымасці знешнеэканамічных адносінаў.

На сёняшні дзень практычна ва ўсіх эканамічных ВНУ, у тым ліку недзяржаўных, маюцца факультэты міжнародных эканамічных адносінаў, на якіх дэталёва вывучаецца сусветная эканоміка, міжнародныя эканамічныя сувязі, але гісторыя знешнеэканамічных сувязяў Беларусі, асаблівасці узаемаадносінаў беларускіх зямель з іншымі краінамі на розных этапах гістарычнага развіцця спецыяльна не разглядаюцца, адпаведны курс альбо спецкурс не выкладаецца.

Такая сітуацыя склалася не выпадкова. Беларускія навукоўцы, даследчыкі эканамічнай гісторыі Беларусі, надаючы значную ўвагу ў сваіх працах праблемам развіцця сельскай гаспадаркі, рамяства, мануфактур,

прамысловасці, ходу эканамічных рэформ (гэтыя аспекты асвятляюцца ў курсе эканамічнай гісторыі Беларусі) значна меньш аналізавалі ролю знешнеэканамічных адносінаў у гаспадарчым развіцці Беларусі. Праблемы знешнеэканамічных сувязяў Беларусі толькі закранаюцца пры асвятленні эканамічнай гісторыі таго ці іншага перыяду.

І гэта не выпадкова. У гістарычнай і эканоміка-гістарычнай літаратуры матэрыялы па знешнеэканамічных сувязях Беларусі прадстаўлены ў асноўным фрагментарна. Адсутнічаюць спецыяльныя даследаванні абагульняючага характару аб знешнеэканамічных сувязях беларускіх зямель да найноўшага перыяду. У даследаваннях савецкіх гісторыкаў матэрыялы па эканамічных сувязях Беларусі, БССР таксама не вызначаюцца дастатковай сістэматызацыяй. Таму ёсць аб"ектыўныя прычыны: некалькі стагоддзяў Беларусь з"яўлялася часткаю іншых дзяржаў. Фарміраванне сувязяў адбывалася ў межах гэтых дзяржаў, з выхадам на іншыя рынкі. Мяркуецца, што сувязі беларускіх зямель з іншымі землямі Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі, рэспублікамі СССР у курсе знешнеэканамічных сувязяў Беларусі можна разглядаць двухбакова, у пэўным сэнсе як знешнія сувязі адносна тэрыторыі Беларусі.

Другая праблема—змены ў самой этнічнай тэрыторыі Беларусі, якая скарацілася ў 20-м ст., параўнальна з 16-м. У нашым стагоддзі тэрыторыя таксама не вызначалася пастаянствам, падвяргалася перадзелам. Гэтыя акалічнасці выклікаюць цяжкасці і праблемы пры вызначэнні канцэптуальных падыходаў.

Усё вышэй адзначанае –гэта праблемы, якія трэба вырашаць, і яны ніколькі не прымяншаюць неабходнасць распрацоўкі і увядзення ў праграму навучання па спецыяльнасці ЗЭД курса (спецкурса) – "Гісторыя знешнеэканамічных сувязяў (альбо адносінаў) Беларусі", які б даў дакладную інфармацыю нашым студэнтам не толькі аб тым, як транзітнае становішча Беларусі на скрыжаванні гандлёвых шляхоў заўсёды было важнейшай крыніцай багацця жыхароў нашых зямель, якімі былі традыцыі экспарту-імпарту, які уклад уносілі нашы продкі у сусветную эканоміку, якія прынцыповыя змены ў экспарце-імпарце адбыліся ў другой палове 20 ст. і г.д., але і дазволіў бы больш паспяхова, з улікам уласных і дзяржаўных інтарэсаў, ажыццяўляць дзейнасць на міжнародным рынку.

Патрабуюцца дадатковыя даследаванні і намаганні, каб падрыхтаваць асобную праграму, падручнік, ды й наогул распрацаваць канцэптуальныя падыходы да азначанай праблемы. У сувязі з гэтым прадстаўляецца неабходным звярнуць увагу кафедры эканамічнай гісторыі на распрацоўку праблематыкі гісторыі знешнеэканамічных сувязяў Беларусі праз аспірантуру і дактарантуру. У перспектыве падрыхтаваць праграму і вучэбны дапаможнік па спецкурсу "Гісторыя знешнеэканамічных сувязяў Беларусі". Дэканат факультэта МЭА можа ў дадзеных абставінах выступіць заказчыкам адпаведнага курса.

*Кабанёльс Пьер*
Париж

## МЕЖДУНАРОДНАЯ ПЕРЕДАЧА ЗНАНИЙ В ОБЛАСТИ УНИВЕРСИТЕТСКОГО УПРАВЛЕНИЯ

Уважаемые коллеги,

- Позвольте мне от имени Парижского Института Управления Предприятиями Сорбоннского Университета и его директора Ж.П. Елфера и директора по международным делам Мишеля Ребюффата Вас поздравить с шестидесятипятилетием Вашего университета.